Грамадска-палітычная газета Іванаўскага раёна

# Чырвоная Звязда

Выдаецца з 1943 г.

кошт у розніцу 250 рублёў

18 студзеня 2011 аўторак № 5 (8585)

## На вышэйшым узроўні

**Беларусі трэба ўдасканальваць грамадзянскую супольнасць і адыходзіць ад «плошчаў». Аб гэтым 12 студзеня заявіў журналістам старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль Рубінаў.**

Кіраўнік Савета Рэспублікі адзначыў, што нельга не браць пад увагу тыя 20 працэнтаў выбаршчыкаў, якія галасавалі на мінулых выбарах або за альтэрнатыўных кандыдатаў, або супраць усіх. Неабходна больш уважліва ставіцца да гэтай часткі насельніцтва.

Спікер верхняй палаты падкрэсліў, што настроі пратэсту ёсць у любым грамадстве. Поўная аднадумнасць магла быць толькі пры Сталіне. У нармальным свабодным грамадстве ёсць розныя суджэнні. Аднак усё гэта павінна мець цывілізаванае выяўленне. Той, хто мае альтэрнатыўнае меркаванне, павінен мець магчымасць нармальна яго выказваць.

❑

**Экалагічны турызм з'яўляецца для Беларусі найбольш перспектыўным напрамкам. Такое меркаванне выказаў 12 студзеня журналістам дырэктар дэпартамента па турызму Міністэрства спорту і турызму Беларусі Вадзім Кармазін.**

Попыт на экалагічны турызм сёння павялічваецца практычна ва ўсіх краінах свету (у сярэднім на 15-20 працэнтаў). Беларусь не стане выключэннем. «Тым больш што для гэтага ёсць усе ўмовы: унікальная прырода, турыстычныя базы, сельскія сядзібы», - лічыць дырэктар дэпартамента.

Другімперспектыўнымнапрамкам ён назваў транзітны турызм, які ў Беларусі выкарыстоўваецца недастаткова. Аднак улічваючы, што ў 2010 годзе Беларусь наведалі 4,1 млн. іншаземцаў, развіццё гэтага напрамку будзе мець поспех.

*БЕЛТА.*

☑ *19 января - День спасателя*

# Виктория, значит - победа!



Связать свою жизнь с профессией спасателя Виктория-школьница даже не мечтала – собиралась поступать в экономический вуз. Но она была еще и хорошей спортсменкой, активно участвовала в общественной жизни своей родной Парахонской средней школы Пинского района. И вот когда училась уже в выпускном классе, поступает неожиданное предложение: ее могут направить на факультет по подготовке спасателей Гомельского университета. Викторию это буквально шокировало. Она и представить себя в военной форме не могла. Наверное, и не уговорили бы, если б не поделилась такой новостью со старшим братом, который к тому времени уже отслужил в армии. Он то и убедил, что такой спортивной и настойчивой девушке трудности жизни спасателя вполне по плечу.

**НА СНИМКЕ:** Виктория Велкова.

*Фото В. МИХАЛЬЧУКА.*

*(Окончание на 3-й странице)*

# НАВІНЫ РАЁНА

## Сувеніры – немаўляткам

У пачатку новага 2011 года ў аддзяленні ЗАГСа Іванаўскага райвыканкама адбылася рэгістрацыя самых маленькіх жыхароў горада, якія нарадзіліся ў канцы мінулага года. Ва ўрачыстай абстаноўцы шчаслівыя бацькі васьмярых нованароджаных (сярод іх пяць дзяўчынак і тры хлопчыкі, прытым два хлопчыкі – браты-двайняткі) атрымалі першы дакумент сваіх дзяцей, які засведчвае асобу, якім адкрываецца першая старонка будучай біяграфіі нованароджанага чалавека.

Падчас раданай цырымоніі супрацоўнікі аддзела ЗАГСа цёпла павіншавалі бацькоў з незабыўнай падзеяй у іх жыцці і разам з пасведчаннем уручылі на памяць сувеніры: набор паштовак з выявамі роднага горада, гараскопы з характарыстыкай знака задыяка, пад якім нарадзіліся дзеці.

Хай жа маленечкія іванаўцы, бласлаўлёныя лёсам, сагрэтыя любоўю і пяшчотаю бацькоў, клопатам дзяржавы вырастаюць годнымі грамадзянамі роднай краіны.

## Зачаравалі "Над Няслухай жураві"

Шматгадовае чалавечае і творчае сяброўства звязвае нашага іванаўскага кампазітара Валянціна Перапёлкіна і паэтэсу Лізавету Саханчук, жыхарку вёскі Яечкавічы. Вынікам іх плённага супрацоўніцтва сталі непаўторныя, хвалюючыя песенныя творы.

Цудоўныя песні палюбіліся не толькі жыхарам Іванаўшчыны. У абласным конкурсе "Песня года-2010" лірычны твор "Над Няслухай жураві" таленавітых творцаў атрымаў Гран-пры Брэсцкага аддзялення Саюза кампазітараў Беларусі ў намінацыі "Мая малая Радзіма".

## Выхаванне духоўнасці

На Іванаўшчыне шырока адзначаліся калядныя ўрачыстасці. Практычна ва ўсіх сельскіх Дамах культуры раёна прайшлі канцэртныя праграмы, прымеркаваныя да радаснага свята нараджэння Хрыстовага з абходамі-віншаваннямі насельніцтва, пажаданнямі многіх шчаслівых летаў.

Цэнтр культуры і народных традыцый напярэдадні старога Новага года на гарадской плошчы ля елкі правёў святочны ранішнік для дзяцей укладчыкаў "Белаграпрамбанка".

Праз ушанаванне культурных традыцый адбываецца далучэнне беларусаў да шматвекавой народнай спадчыны, выхаванне нацыянальнай свядомасці і патрыятызму.

*Ірына САЛОМКА.*

# Фальклорны фэст пашырае межы

Гэты традыцыйны для Іванаўшчыны фестываль "Фальклор без межаў" яшчэ як апраўдвае сваю назву. Ён сапраўды не мае межаў не толькі прасторавых, але і часавых.

Справа ў тым, што калі папярэдніх пяць год ён займаў адзін дзень, то сёлета пашырыўся да двух – **21 і 22 студзеня (пятніца і субота).**

На першы дзень запланаваны заезд калектываў у в.Тышкавічы (пачынаючы з 10.00), **адкрыццё фестывалю ў мясцовым ДК (14.00)**, у якім упершыню ў гісторыі гэтага мерапрыемства, якое ладзіцца ўжо шосты раз, прымуць самы непасрэдны ўдзел шэсць царкоўных хораў з розных куткоў Палесся, **выступленні самадзейных артыстаў Беларусі і замежжа ў працоўных калектывах раёна (18.00), у тым ліку канцэрт у Іванаве** (чытайце побач афішу).

Галоўнае ж дзейства адбудзецца на наступны дзень, **22 студзеня, у 12.30 у Тышкавіцкім Доме культуры**. Гэта будзе **вялікі гала-канцэрт** з удзелам усіх гасцей, а таксама цырымонія ўзнагароджання пераможцаў, якую правядзе кіраўнік Іванаўскага раёна Юрый Юр'евіч Бісун. **Кошт білета** на гала-канцэрт – **10 000 рублёў**.

У гэты ж суботні дзень з раніцы, у 10.30, кіраўнікі фальклорных калектываў дадуць прэс-канферэнцыю раённым і абласным сродкам масавай інфармацыі.

Абавязкова прыходзьце і прыязджайце на гэтае велічнае фальклорнае свята. Тут вас чакае шмат навінак, у ліку якіх самыя розныя паляшуцкія забавы, частаванне гарачымі стравамі, цікавыя конкурсы...

Вось такія захапляльныя мерапрыемствы чакаюць нас ужо праз тры дні.

**Тэлефоны для даведак: 2-18-61, 2-16-97.**

**21 студзеня Дом культуры**

**Паважаныя жыхары і госці г. Іванава!**

**Запрашаем вас на канцэрт у рамках фестывалю**

**«Фальклор без межаў»**

**у праграме:**

▶ **заслужаны аматарскі калектыў РБ ансамбль танца «Гарадзенскія карункі» (г. Гродна)**

▶ **узорная эстрадна-вакальная група «Фантастыка» (г. Пінск)**

▶ **Народны ансамбль музыкі і песні «Мірскія музыкі» (г. Баранавічы)**

**Пачатак у 18.00; кошт білета 10 000 руб.**




МОЛОДЕЖНЫЙ ТЕЛЕТАЙП

# Главные события минувшего года

**Январь.** Состоялась финальная интеллектуальная игра «Что? Где? Когда?» среди молодежных организаций района. Всего в турнире приняли участие 24 команды.

**Февраль.** Проведен городской конкурс «Вперед, мальчишки!», в котором приняли участие ученики 5-х классов школ города. Впервые в деревне Одрижин проведен зимний туристический слет среди работающей молодежи.

**Март.** В результате акции «Мы - граждане Беларуси!» лучшие ученики школ района в торжественной обстановке получили паспорт гражданина Республики Беларусь.

**Апрель**. В Ивановском районе состоялся районный слет отрядов «Милосердие», в котором приняли участие представители 30 отрядов школ района. В результате выборов в местные Советы депутатов 16 представителей молодежи стали депутатами районного и сельских Советов депутатов.

**Май.** Проведена районная игра «Зарница». Состоялся семинар-учеба с молодыми людьми, включенными в перспективный кадровый резерв райисполкома.

**Июнь.** Праздничные мероприятия ко Дню молодежи прошли во всех сельсоветах и г. Иваново. Проведен молодежный лагерь «Актив–2010» на озере Завышанское. Начал свою работу лагерь молодежного спортивного клуба «Асахи».

**Июль.** На районный туристический слет собрались 18 команд молодежи организаций района. На озере Завышанском проведен волонтерский лагерь ОО «БРСМ» «Волонтер».

**Август.** В г. Иваново проведен третий районный слет молодых семей.

**Сентябрь.** Состоялась встреча руководства района с молодыми специалистами и молодыми работниками, прибывшими на работу в район в 2010г.

Команда молодежи района заняла 1-е место в межрайонном туристическом слете в Пинском районе.

Впервые в районе прошел межрайонный слет молодых специалистов с участием молодежи из Ганцевичского, Пинского, Ивацевичского районов.

**Октябрь.** Впервые в районе проведена спартакиада среди членов добровольных дружин. Лучшими добровольными дружинами среди сельсоветов по итогам работы за год признаны дружины Мотольского, Опольского и Одрижинского сельисполкомов.

**Ноябрь.** В центре культуры и народных традиций проведена конкурсная программа «Мисс Осень-2010». Звание «Мисс Осень» получила Ольга Бенда. Начался отборочный тур интеллектуальных игр «Что? Где? Когда?» среди работающей молодежи.

**Декабрь.** Ко Дню борьбы со СПИДом проведена спартакиада среди работающей молодежи.

По итогам областного конкурса на «Лучшее сельское подворье молодой семьи» первое место заняла семья Сергея и Марии Пилиповичей из деревни Мотоль.

Совет молодежи СПК «Агро-Мотоль» занял первое место в областном конкурсе на лучший совет молодежи среди сельскохозяйственных организаций.

Подведены итоги районного конкурса «Музей – лучший друг школы».

***Диана КРЕСС,***
***начальник отдела по делам молодежи райисполкома.***

*Актывісты*



# Аўтарытэт справай мацуецца

Дзмітрый Багдановіч і Павел Цямчык, якіх вы бачыце на гэтым здымку, прадстаўляюць пярвічную маладзёжную арганізацыю ГА "БРСМ" з СПМК-7, якая, дарэчы, славіцца на ўсю вобласць высокай якасцю аддзелачных работ.

Апошнім часам будаўнічая арганізацыя бездакорна здала ў эксплуатацыю раённую бальніцу на 240 месцаў у Лунінцы, будынак Іванаўскага аддзялення Дэпартамента аховы МУС РБ, нямала катэджаў у аграгарадках раёна, правяла капітальныя рамонты Моладаўскай, Яечкавіцкай, Мотальскай школ, дзіцячых садкоў. Неўзабаве, як падзяліліся маладыя будаўнікі, аддзелачнікі распачнуць капітальны рамонт гарадскога дзіцячага садка №4. І на ўсіх аб'ектах важкі ўклад у агульную справу ўносіць моладзь.

Субяседнікі з веданнем справы расказалі нам не толькі пра тое, як ім цікава і добра працуецца ў калектыве, але і пра наладжванне змястоўнага культурнага адпачынку. І гэта заканамерна, бо Дзмітрый, працуючы тэхнікам планава-вытворчага аддзела, да таго ж, з'яўляецца сакратаром пярвічнай маладзёжнай арганізацыі. У гэтым жа аддзеле шчыруе інжынерам і яго сябар Павел Цямчык.

Але, на думку юнакоў, найбольшай пахвалы за штодзённую старанную працу заслугоўваюць не інжынерна-тэхнічныя работнікі, а непасрэдна рабочыя, да прыкладу, маладыя плітачнікі Анатоль Волікаў, Дзяніс Цярлецкі, Дзяніс Сулім, маляры-тынкоўшчыкі Ірына Рогава, Ірына Япішка, Юрый Радкавец, Святлана Дабрадзей і іншыя.

***Валерыя КУХАРЧУК.***

**НА ЗДЫМКУ: Дзмітрый Багдановіч і Павел Цямчык.**
***Фота Валерыя МІХАЛЬЧУКА.***

*Ведай нашых!*

# Лепшае падвор'е – у Піліповічаў з Моталя

Па добрай традыцыі напрыканцы года падводзяцца вынікі разнастайных конкурсаў. Вось і нядаўна абласным камітэтам узнагароджаны пераможцаў конкурсу на лепшы савет моладзі пярвічных маладзёжных арганізацый ГА "БРСМ" Брэстчыны.

Дарэчы, з кожным годам у вобласці павялічваецца колькасць маладых людзей, якія пасля вучобы з ахвотай вяртаюцца ў родныя мясціны, ствараюць сем'і, абжываюцца ў прадастаўленых гаспадаркамі сучасных катэджах ці па льготных крэдытах будуюць уласнае жыллё. У выніку прыкметна расце колькасць пярвічных маладзёжных арганізацый, а, значыць, і саветаў па справах моладзі. Таму вельмі няпроста было абласному журы вызначыць лепшае згуртаванне лідараў, бо ў вобласці дзейнічае больш за 600 такіх падраздзяленняў.

Прымаючы да ўвагі ўсебаковыя напрамкі работы, лепшым саветам моладзі сярод сельскагаспадарчых кааператываў прызнаны савет СВК "Агра-Моталь", з чым мы шчыра віншуем сакратара пярвічнай маладзёжнай арганізацыі Марыю Аляксандраўну Рамановіч і ўсю моладзь кааператыва.

Мабыць, многія нашы чытачы звярталі ўвагу на тое, што на старонках газеты час ад часу з'яўляліся публікацыі пад конкурснай рубрыкай "На лепшае падвор'е маладой сям'і". Дык вось, аналагічны конкурс праводзіўся і ў вобласці. І як жа было прыемна, калі бясспрэчным лідарам зноў жа прызнана лепшае падвор'е маладой сям'і з Іванаўшчыны. На гэты раз шчаслівчыкамі сталі Сяргей і Марына Піліповічы з вёскі Моталь.

Нагадаем, што Сяргей Мікалаевіч працуе намеснікам старшыні СВК "Агра-Моталь" па ідэалагічнай рабоце і старшынёй прафсаюзнага камітэта гаспадаркі, а яго жонка Марына старанна шчыруе ў вытворчым кааператыве "Моталь". У дружнай сям'і выхоўваюцца два сыночкі, якія, па прыкладзе бацькоў, таксама любяць прыбіраць падворак, даглядаюць кветкі.

***Надзея КУХАРЧУК.***

*Как дела, первичка?*

# Доброе слово о лучшем совете

**С приходом на должность заместителя председателя по идеологической работе Сергея Николаевича Пилиповича заметно оживилась жизнь молодежной организациии СПК «Агро-Мотоль», которую возглавляет Мария Александровна Романович – юрист проектно-сметного бюро. Коллектив этот наполовину состоит из молодежи. Он в основном и задает тон во всех молодежных начинаниях.**

В сельхозкооперативе работают 137 человек от 18 до 31 года. Из них членами первичной организации ОО «БРСМ» являются 37 человек. Это в основном выпускники высших и средних специальных заведений, которые интересуются политикой, культурой, спортивной жизнью общества, живут внутренними проблемами коллектива. Помимо того, что каждый из них ответственно относится к своим должностным обязанностям, они принимают активное участие в общественных мероприятиях.

Радуют своими спортивными достижениями Василий Михайлович Бухалко, Виталий Васильевич Минюк, Ольга Александровна Калилец, Сергей Петрович Палто. Постоянным участником программ художественной самодеятельности является Людмила Валерьевна Корец.

Активное участие наша молодежь принимала в организации и проведении международного фестиваля «Мотальскія прысмакі», туристических слетов и поездки в Жировичский монастырь, в выдвижении кандидатов на четвертое Всебелорусское народное собрание и выборах Президента Республики Беларусь.

Есть в молодежной среде и своя команда знатоков. Самыми эрудированными признаны местные интеллектуалы Ирина Викторовна Теребей – агроном, Василий Михайлович Бухалко, Галина Павловна Минюк, Владимир Александрович Русак, Николай Владимирович Мишковец, Мария Александровна Романович – инженеры пректно-сметного бюро. Они неоднажды признавались победителями популярной интеллектуальной игры «Что? Где? Когда?».

На нынешний год запланировано немало новых интересных мероприятий. В числе ближайших – поездки в Беловежскую пущу и Мирский замок, участие в спортивных соревнованиях и культурных программах.

С уверенностью можно сказать, что молодежь сельхозкооператива выбирает себе занятия по своим способностям, нравственным и деловым качествам, чувствуя себя при этом равными в одной команде.

***Людмила СЕРГЕЕВА.***

**Уважаемая**
**Алла Ивановна Котковец!**

Сердечно поздравляем Вас с юбилейным днем рождения! Крепкого здоровья, семейного благополучия, оптимизма, большого личного счастья.



*Пожелать хотим с любовью*
*Счастья, радости, здоровья.*
*Чтобы ласковым теплом*
*Был всегда согрет Ваш дом.*
*И желаем Вам везенья,*
*Всех желаний исполненья!*
*Каждый день и каждый год*
*Пусть удачу Вам несет!*
*Коллектив редакции райгазеты «Чырвоная звязда».*

# В Комитете государственного контроля

В 2010 году в Комитет госконтроля Брестской области поступило 1 162 письменных обращений, на личный прием обратились 805 человек (2009 год – 645). При этом Комитетом проведено 73 прямые линии с приемом граждан, на которые обратился 651 человек (2009 год – 473).

В результате проведенных по обращениям проверок Комитетом государственного контроля Брестской области и межрайонными комитетами взыскано экономических санкций на сумму 6,4 млн. рублей, 21 человек привлечен к административной ответственности, 28 человек – к дисциплинарной ответственности, возбуждено 5 уголовных дел.

Кроме того, коллегией Комитета рассмотрена работа с обращениями граждан и определены меры по ее совершенствованию.

Комитет государственного контроля Брестской области информирует жителей Брестчины о том, что в Комитете (г.Брест, ул.Мицкевича, 3) действует телефон «Горячая линия».

Если Вы обладаете достоверными сведениями о правонарушениях, допускаемых в области финансовых, хозяйственных и налоговых отношений, в сфере торговли и оказании услуг, при использовании бюджетных средств и государственного имущества, осуществлении внешнеэкономической деятельности, звоните по телефонам «Горячая линия» 8-0162-21-00-33 и 8-0162-23-16-90.

«Горячая линия» работает с 9.00 до 18.00 в рабочие дни.

Ваша объективная информация будет использована в работе Комитета государственного контроля и результаты ее рассмотрения доведены до сведения населения через средства массовой информации.

**КГК Брестской области.**

*19 января - День спасателя*

# Профилактика – рычаг действенный

Накануне профессионального праздника спасателей в Ивановском районном отделе по чрезвычайным ситуациям состоялась встреча начальника Ивановского районного отдела по чрезвычайным ситуациям с журналистами «ЧЗ», во время которой он подвел некоторые итоги деятельности Ивановского РОЧС.

Характеризуя обстановку, сложившуюся в прошедшем году, начальник Ивановского РОЧС отметил, что 2010 год был достаточно сложным и напряженным. Он потребовал четких оперативных действий. В целом по сравнению с 2009 годом количество чрезвычайных ситуаций уменьшилось на 5,3%. Это – свидетельство того, что профилактическая работа дает свои плоды. Вот только гибель людей, к большому сожалению, осталась на прежнем уровне – в 2010 году, как и в 2009-м, погибло 6 человек.

Что касается других важных показателей, то за счет максимально быстрого прибытия к месту происшествия подразделениями удалось снизить ущерб от различных чрезвычайных ситуаций на 10,2%. В прошедшем году подразделениями спасено 14 человек, 213 голов скота, 123 строения, 1000 тонн кормов, 17 единиц техники, материальных ценностей на сумму 3 482 382 000 руб. Это говорит о многом. К примеру, о том, что люди так и не научились заботиться о собственной безопасности и безопасности хозяйств, зданий и сооружений. В связи с этим продолжается реализация Республиканского плана мероприятий по предупреждению пожаров и гибели от них людей на 2010-2012 годы. Сделано уже довольно много. В частности, в 2010 году в домовладениях установлено 1920 автономных пожарных извещателей, которые, как известно, в пять раз сокращают гибель людей в случае пожара. К слову, на сегодняшний день семь человек спасены именно благодаря сработке АПИ.

**Антонина КИТ.**

# Виктория, значит - победа!

Окончание. Начало на 1-й стр.

Тем более, что профессия инженера-спасателя по предупреждению и ликвидации ЧС, которая ей предлагается, вполне подходит к ее живому и очень контактному характеру. И офицерские погоны ей тоже будут к лицу.

В конце концов Виктория смирилась: что ж, спасатель так спасатель. Ничего, что хрупкая, главное, чувствует себя сильной. Да и имя в переводе с латинского прочитывается как победа. С таким именем сам Бог велел побеждать.

Примечательно то, что на считавшийся доселе мужским факультет института девчат в тот год начали принимать впервые, поэтому диплом, а вместе с ним звание лейтенанта внутренней службы, Виктория Велкова вместе с десятком однокурсниц получила первой в истории учебного заведения.

Попасть на работу хотела, конечно же, в родной райцентр, откуда и направление на учебу получала. Честно говоря, на какое-то право выбора рассчитывала: все-таки имела самый высокий балл диплома среди представителей Брестской области. Но после того, как распределительная комиссия вынесла свой вердикт, расстроилась. Оказалось, что ее направляют в Иваново, поскольку там появилась вакансия (как раз к этому времени инспектор по пропаганде РОЧС, наш активный внештатный корреспондент Александр Бахуревич, отслужив положенный срок, ушел на заслуженный отдых). Чуть слезы не брызнули из ее очаровательных глаз. Но понимала – она, человек военный, и приказ для нее – закон.

Ехала не без волнения. И вдруг – теплый прием в отделе, расположение руководства, помощь коллег и тех, с кем непосредственно соприкасается при выполнении функциональных обязанностей... В итоге девушка в считанные дни почувствовала себя неотъемлемой частью дружного коллектива, быстро освоилась на новом месте, познакомилась с районом, и без раскачек начала усиленно заниматься противопожарной профилактикой. «Поднапрягает» она в этом плане и редакцию газеты. Читатели, без сомнения, это заметили. Информации за подписью Виктории Велковой можно увидеть едва ли не в каждом номере «Чырвоной звязды». А еще она активно выступает в трудовых коллективах, организовывает сходы сельчан и рейды. И все это с одной-единственной целью – чтобы меньше было пажаров, чтобы не гибли в огне люди, чтобы меньше было горя на вверенной ей территории.

**Василий ЖУШМА.**

# Хто перайманоўвае вёскі?



*Несцерка*




**Усё часцей да нас у рэдакцыю паступаюць пісьмы не ў канверце, як раней, а па электроннай пошце. Праўда, калі да надаўняга часу зваротны адрас указваў на Брэст, Мінск або наогул замежжа, дык з прыходам Інтэрнэта ў сельскую мясцовасць мы маем магчымасць аператыўна звязвацца з вёскамі, нават маленькімі вёсачкамі альбо хутарамі. Так і гэты ліст, які падштурхнуў рэдакцыю ўзняць на старонках газеты цэлую праблему, таксама па "электронцы" дабраўся да нас за лічаныя секунды з Хамічава. Вось яго змест:**

*"Добры дзень, рэдакцыя газеты "Чырвоная звязда". Звяртаецца да вас жыхар вёскі Хамічава Кузьмінчук Мікалай Васільевіч. Жыву тут з нараджэння, працую ў школе настаўнікам. Побач з маім домам стаіць дарожны знак, на якім калісьці была пазначана правільная назва населенага пункта – Хамічава. Але не так даўно прыехалі дзядзькі з дарожнай службы з пэндзлямі і фарбай і за лічаныя хвіліны перайменавалі вёску ў Хомічава, не спытаўшы жыхароў, ці хочуць яны жыць у паселішчы з іншым імем. Цяпер у нас, атрымліваецца, і пашпарты несапраўдныя, і многія іншыя дакументы? Ад газеты "Чырвоная звязда" я хацеў бы пачуць каментарый наконт гэтага".*

Дзякуй Вам, паважаны Мікалай Васільевіч, за падказку! Гэтая тэма ўвогуле патрабуе асобнай і вельмі пільнай увагі як з боку журналістаў "раёнкі", так і адпаведных службаў, бо памылкі на дарожных знаках, падобныя да той, якую Вы прывялі ў лісце, не адзінкавыя. Вось чаму Несцерка вырашыў праехацца па раёне, каб потым падказаць арганізацыям, якія абслугоўваюць транспартныя артэрыі, дзе яны дапусцілі памылкі. Для пачатку вырашылі рухацца па поўдзень ад Іванава, да чаго падштурхнуў працытаваны вышэй ліст.

Першы непрыемны сюрпрыз – адразу па выездзе з горада ў напрамку Украіны, якраз насупраць карпусоў былога кансервавага завода. Паўзіраліся чэлы нашай рэйдавай брыгады ў шыльды і падумалі: так-так, трэба быць надта вялікім жартаўніком, каб пераблытаць адлегласць ад райцэнтра да населеных пунктаў. Адзін "верставы" знак паведамляе, што ад Іванава да Махро – 23 кіламетры. Праз тры сотні метраў новы ўказальнік інфармуе, што да прыгранічнай вёскі Калена – 22 кіламетры. На самой жа справе апошні населены пункт ажно на пяць кіламетраў далей за папярэдні. Здзіўляе яшчэ і тое, што знакі гэтыя ўстаноўлены некалькі гадоў таму, але ніхто так і не выправіў недарэчнасць.

Далей кіруемся ў Крытышынскі сельсавет да вёскі Радаўня. Чытачы падказалі нам, што і там шыльда таксама ўтрымлівае памылку. Мы ведаем: зараз пад'едзем і прачытаем – "Радавня" замест Радаўня. Але тое, што ўбачылі, абурыла яшчэ больш. Нейкія жартаўнікі, заўважыўшы такі хіб, у літары "в" сцерлі правую ніжнюю частку, ператварыўшы яе ў "р". Атрымалася Радарня.

Пры ўездзе на мост у Кужалічыне – таксама памылка. Шыльда паведамляе, што перасякаем Днепра-Бугскі канал. Правільна ж будзе: Дняпроўска-Бугскі або Днепрабуг. Водны шлях з першай назваю, калі хто не ведае, таксама існуе. Толькі за некалькі соцень кіламетраў на паўднёвы захад ад нашых мясцін. "Куды ж мяне занесла?" - падумае дасведчаны вандроўнік, які добра ведае геаграфію.

Не зусім зразумела, навошта памянялі шыльду, якая не ўтрымлівала памылак, на аўтобусным прыпынку ў вёсцы Завышша. Цяпер яна паведамляе, што пасажыры прыехалі ў Завышанскае. Але ж так называецца толькі мясцовае возера. А прыпынкам прысвойваюцца назвы перш за ўсё вёсак.

Яшчэ на адзін знак папрасіў рэдакцыю звярнуць увагу наш пазаштатны аўтар Васіль Пернач. Гэты знак устаноўлены ў в.Туляцічы і ўказвае на суседнюю вёску Заверша, якая размешчана на тэрыторыі Драгічынскага раёна. Дык вось, на той шыльдзе ў назве вёскі ўтрымліваецца два "Ш". А павінна быць адно.

І гэта яшчэ не ўсе недакладнасці. Магчыма, мы ў нейкі населены пункт не даехалі і нечага не прыкмецілі. Што ж, тады чакаем пісьмаў-падказак. Балазе, добры прыклад падаў шаноўны М.В.Кузьмінчук. Яшчэ лепей было б правесці своеасаблівую рэвізію дарожных знакаў і ўказальнікаў, прывесці іх у адпаведнасць з сапраўднымі назвамі населеных пунктаў і геаграфічных аб'ектаў, узгадніць са спецыялістамі, параіцца пры перакладзе на беларускую мову з філолагамі, і толькі тады ўстанаўліваць у адпаведных месцах гэтую выключна важную для ўдзельнікаў дарожнага руху інфармацыю.

**НЕСЦЕРКА.**

**Фотакалаж Валерыя МІХАЛЬЧУКА.**

*Энергонадзор предупреждает*

# ОСТОРОЖНО: ЭЛЕКТРИЧЕСТВО!

Сегодняшнее мое обращение – к юным жителям района.

**ДОРОГИЕ РЕБЯТА!**

Впереди у вас долгая и счастливая жизнь! Каждому из вас предстоит пережить много радостных моментов, сделать множество полезных дел, преодолеть трудности и добиться успеха. Но для того, чтобы так было, не подвергайте себя ненужному риску, соблюдайте правила электробезопасности. Они просты, но их всегда нужно помнить, ими руководствоваться.

**ПОМНИТЕ!**
**НЕЛЬЗЯ:**

*Залезать за ограждения трансформаторных подстанций, открывать электрические щиты, заходить в помещения электроустановок, даже если они не закрыты. Всегда обращайте внимание на предупреждающие надписи и знаки.

*Набрасывать на провода линий электропередачи проволоку, посторонние предметы, бить изоляторы, запускать бумажные змеи вблизи этих линий.

*Приближаться к оборванным, лежащим на земле проводам линий электропередачи на расстояние менее 8 метров и ни в коем случае к ним прикасаться.

*Влезать на опоры линий электропередачи, на крыши зданий, над которыми эти линии проходят.

*Оставлять без присмотра включенные электроприборы, заполнять водой включенные в сеть электрочайники.

*Пользоваться бытовыми приборами, штепсельными розетками, включателями с поврежденными корпусами и крышками, удлинителями и шнурами с поврежденной изоляцией, а также самодельными электроприборами и удлинителями.

*Пользоваться электроприборами в сырых помещениях, в помещениях с токопроводящими полами и вне помещений.

Если вы заметили какие-то неисправности, обязательно обращайте на них внимание взрослых - они часто не замечают таких повреждений!

**ПОМНИТЕ!**

Поражение электрическим током может произойти даже без прикосновения к токоведущим частям.

**В.НИКОНЧУК, инспектор "Энергонадзора".**



## Поздравляем!

От всей души поздравляем
**Нину Александровну ЖИДКОВИЧ** с юбилеем!

***Пусть небо будет ясным над тобой, а счастья - полные ладони, а в сердце ласковом твоем пусть никогда не будет боли. Пусть в жизни греет добрый свет, пусть стороной пройдут ненастья, желаем мы на много лет здоровья, радости и счастья.***

*Семьи Томильчик, Власовец, Козеко, Бондарук, Мацкойть, д. Залядынье.*

❊❊❊

От всей души поздравляем
дорогую мамочку и бабушку
**Анну Матвеевну ЛАГОДИЧ**
с Днем рождения!

***Спасибо, мама дорогая, за твой нелегкий женский труд, за нас, детей, что ты взрастила, внучат, которые растут. За доброту, за золотые руки, за материнский твой совет, за то, что ты душой красива, за то, что жизнь нам посвятила, за все спасибо, мама дорогая. Здоровья крепкого в награду желаем мы, тебя любя, тепла от всех, кто будет рядом, и пусть Господь хранит тебя.***

*С уважением и любовью дети и внуки, д. Снитово.*

❊❊❊

Дорогую и любимую жену и маму
**Марию Ивановну ПЛЕВАКО**
поздравляем с юбилеем!

***Пусть годы идут за годами, о том, что прошло, не грусти. И всем, кто когда-то обидел, обиды всем сердцем прости. Не трать свои нервы напрасно, здоровья не купишь нигде, пусть жизнь твоя будет прекрасна, мы счастья желаем тебе. Пусть года торопятся упрямо, но для нас дороже нет тебя, будь здоровой, будь счастливой, мама, не тревожься, береги себя!***

*Любящие тебя муж, дети Юлия, Максим, Никита, Кирилл, Ангелина, Дарья, Захар, Софья.*

❊❊❊

Поздравляем дорогого, любимого
мужа, отца и дедушку
**Сергея Артемьевича ШАЛОТУ**
75-летним юбилеем!

***Пусть Ангел жизнь твою хранит и Бог во всем пусть помогает, надежда в сердце пусть живет всегда, святая вера силы умножает. Отец родной наш, дед любимый, простой, хороший человек, здоровья мы тебе желаем на весь оставшийся твой век. Желаем радости и счастья, причин чтоб не было грустить, и в полном здравии, конечно, до свадьбы правнуков дожить. Пусть поздравлений будет много приятных, добрых, дорогих, а это теплое, простое - прими от нас, твоих родных.***

*Жена, дети, зятья, внуки, правнуки.*

❊❊❊

От всей души поздравляем
**Аллу Ивановну КОТКОВЕЦ** с юбилеем!

***Пусть этот день, который ты встречаешь, счастливой датой в твою жизнь войдет. И все хорошее, о чем мечтаешь, пусть сбудется и пусть произойдет. Пусть Ангел твой хранит тебя, и Бог во всем пусть помогает, а мы тебе от всей души любви, здоровья крепкого желаем.***

*Дочь Наташа, зять Николай, семьи Онисковец, Калилец.*

❊❊❊

Тепло и сердечно поздравляем
дорогого папочку и мужа
**Николая Николаевича КРИВЕЦКОГО**
с Днем рождения!

***В радостный день юбилея мы поздравить тебя спешим, счастья, мудрости, здоровья пожелать тебе хотим. Пусть жизнь твоя невзгод не знает, хотя бывает нелегко, пусть твое сердце согревают уют семейный и тепло. Пусть Бог хранит тебя повсюду и везде, желаем самого большого: прожить подольше на земле.***



*Жена, дети.*

---

**РУЭСП "Днепробугводпуть"**
**приглашает на работу**
## СЛЕСАРЯ-ЭЛЕКТРИКА
**для работы на гидроузле №2 "Переруб"**
**ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА - от 900 тыс. руб.**
За справками обращаться по телефонам:
**8-0165-35-06-64, 8-029-199-53-99.**

---

**ФОТО+ ВИДЕО СВАДЕБ.**
Тел. **8-029-728-70-06.**
ИП ГУЛИДОВ Р.Н. УНН 290311922

---

**ФОТО-,ВИДЕО СЪЕМКА.**
Тел. **8-033-699-20-01.**
ИП ЮРЧУК С. В. УНН 290822928

---



**РЕМОНТ**
**холодильников, морозильников**
**по городу и району.**
**ГАРАНТИЯ.**
Прием заявок по телефонам:
**8-029-346-23-21, 728-35-03, 2-60-79.**
Стаж работы по специальности 24 года.
ИП МОРГАВЧУК А. П. УНН 200073934

---

**Филиалу "Оптторг" Ивановского райпо**
требуются:
⇨ **ПЛОТНИКИ;**
⇨ **ВОДИТЕЛИ автопогрузчика;**
⇨ **ЭЛЕКТРОМОНТЕРЫ;**
⇨ **РАБОЧИЕ;**
⇨ **ГЛАВНЫЙ ИНЖЕНЕР.**
Обращаться: **г. Иваново, ул. Железнодорожная,10.**
Тел.: **2-58-52, 2-47-90.**

---

**ПРОДАЮТСЯ**
**БЛОКИ Г/С, БЛОКИ ФУНДАМЕНТНЫЕ** (демлеры), **ШИФЕР, ШТАКЕТНИК.**
Тел.: **2-41-28, 2-70-95, 8-029-524-62-50.**
Лиц. №12300/0280721 выд. Ивановским РИК до 24.03.2013г.ИП ИГНАТЧУК В. В. УНН 200678316

---

**Дистрибьютор продукции WRIGLEY на территории РБ**
***Wrigley's, Orbit, Eclipse, Hubba Bubba, Skittles, Rondo***
**и других брендов компании**
ПРИГЛАШАЕТ на РАБОТУ
**ТОРГОВОГО ПРЕДСТАВИТЕЛЯ**
по г.г. Иваново/Дрогичин.
**Требования:** наличие легкового автомобиля, наличие в/у категории "В", гибкость, мобильность, коммуникабельность.
***Мы предлагаем обучение и работу в сильной команде, конкурентоспособные условия оплаты труда.***
Контактный телефон **(029) 628-04-78.**
Резюме с пометкой "ТП Иваново/Дрогичин" высылать по факсу **(017) 328-60-53** либо по E-mail: **Kseniya.Ivanova@Wrigley.com**
ОДО "Фрэшлэнд" УНП 190743331

---

**УКСП "Совхоз имени И. А. Поливко"**
ПРОИЗВОДИТ ЗАКУП МОЛОДНЯКА КРС весом до 100 кг
**ТЕЛКИ - 14 000 руб. кг;**
**БЫЧКИ - 10 000 руб. кг.**
***Возможен расчет зерном урожая 2010, 2011 г.г.***
Тел.: **52-1-73** - приемная, **52-1-81** - бухгалтерия, **8-029-380-44-75** - зав. фермой.

---

**СПК "Агро-Мотоль"»**
**производит закуп**
**МОЛОДНЯКА КРС**
**ВЕСОМ до 100 кг:**
**ТЕЛКИ - 14 000 руб. кг;**
**БЫЧКИ - 10 000 руб. кг.**
Тел.: **8-016-52-58-4-30, 58-4-41.**

---

**ПОТЕРЯВШЕГО**
**связку ключей в районе типографии**
(г. Иваново, ул. Ленина,3)
обращаться по тел.:
**2-16-46, 2-15-02.**

---

**ПМК-61 РУП "ПИНСКВОДСТРОЙ"**
на постоянную работу требуются:
**ГЛАВНЫЙ БУХГАЛТЕР; ГЛАВНЫЙ ИНЖЕНЕР с опытом работы; ТОКАРЬ; МАШИНИСТ а/крана.**
Обращаться по тел.: **2-52-37, 8-029-656-08-49.**

---

***Работа для женщин (с 25 лет) в комп.Орифлэйм. Не продажи.***
Тел.: **8-029-782-77-78.**
ИП КУЛИЧ Т. А. УНН590650135

---

**СПК "ГОРБАХА-АГРО" Ивановского района**
**требуются:**
➢ **АГРОНОМЫ;**
➢ **ВЕТФЕЛЬДШЕРА;**
➢ **ЗООТЕХНИКИ;**
➢ **МЕХАНИЗАТОРЫ;**
➢ **ЖИВОТНОВОДЫ.**
ПРЕДОСТАВЛЯЕТСЯ БЛАГОУСТРОЕННОЕ ЖИЛЬЕ.
Обращаться в отдел кадров.
Телефон **57-3-67.**

---

## КУПЛЮ

**ТЕЛКУ.** Дорого. Тел. **8-033-605-96-43.**
ИП НОВИЦКИЙ А. А. УНН 290041707

~

**КОРОВУ, КОНЯ.** Дорого. Тел. **8-029-551-88-88.**
ИП БАТОРИН В. С. УНН 290756604

~

**ТЕЛЕНКА, КОНЯ, КОРОВУ.** Тел. **8-029-726-81-51.** ИП КОНОВАЛЮК А.В. УНН 290102783

~

**БЫКА, КОРОВУ, КОНЯ, ЖЕРЕБЕНКА.** Тел. **8-029-792-52-86.** ИП НОВИК С.Д. УНН 290634735

~

**КОРОВУ, ЛОШАДЬ, ТЕЛКУ.** Тел.: **8-029-529-52-29, 8-044-457-41-84.** ИП ГУРИЧ М. П. УНН 290752412

~

**КОРОВУ, ЛОШАДЬ.** Тел. **8-029-220-62-44.**
ИП КОВАЛЕВИЧ Р.Н. УНН 290229322

---

## КУПЛЮ

**ЧАСЫ, СТАТУЭТКИ.** Тел. **8-029-998-84-32.**

---

**Бродницкому лесничеству**
на постоянную работу требуются:
✓ **ТРАКТОРИСТ;**
✓ **РАБОЧИЕ.**
***Оплата 1-2 млн. руб.***
Телефоны: **30-2-45, 8-029-399-36-41.**

---

**Частному предприятию "ЛДКзубр"**
ТРЕБУЮТСЯ:
**ВАЛЬЩИКИ ЛЕСА; РАЗНОРАБОЧИЕ; ВОДИТЕЛЬ АВТОМОБИЛЯ "УРАЛ" с гидроманипулятором.**
Оплата труда сдельная.
Контактный телефон **8-029-145-61-69.**
УНН 290985780

---

## ЗАКУПАЕМ

**СВИНИНУ.** Тел.: **45-0-39, 829-89-41** (МТС).
ИП КУНАХОВЕЦ В. М.УНН 290818661

**СВИНИНУ.** Тел. **8-029-798-12-71.** ИП МАЛИЧ Е. М. УНН 290820356

**СВИНИНУ.** Тел.: **2-32-31, 8-029-791-90-77.**
ИП МАКАРЧУК О. В. УНН 290819099

**СВИНИНУ.** Дорого. Тел.: **8-029-233-96-39, 2-67-64.** ИП КУЗЬМИЧ Ю. П. УНН 290210310

**СВИНИНУ.** Дорого. Тел.: **8-0165-39-11-07,8-029-978-73-70** (Vel).
ИП ТРУШКО З. Б. УНН 290312880

**СВИНИНУ.** Тел. **8-029-526-69-60.** ИП КУЗЬМИЧ В.В. УНП 290818687

---

## ПРОДАЮТСЯ

**ДОМ** в д. Лясковичи. Тел. **228-42-21** (МТС).

**ДОМ** жилой, 1.5 уровня. Тел. **2-49-26.**

**ДОМ.** Тел. **8-029-822-28-68.**

**ДОМ** в г. Иваново. Тел. **8-029-527-67-47** (МТС).

**1-КОМНАТНАЯ КВАРТИРА** в центре. Тел. **8-029-331-33-72.**

**1-КОМН. КВАРТИРА.** Тел. **8-029-227-61-57.**

**УЧАСТОК** срочно. Тел.: **8-029-729-44-70, 5-64-85.**

**ГАРАЖ** по ул. Чкалова. Тел. **8-029-793-76-40.**

**детская КРОВАТКА.** Тел. **8-033-608-18-15.**

**СВАДЕБНОЕ ПЛАТЬЕ, ШУБКА** б/у, недорого. Тел. **8-029-721-69-47.**

---

**В магазин автомобильных запчастей**
в г. Иваново требуется
**ПРОДАВЕЦ.**
Требования: **знание устройства автомобиля, владение компьютером, возраст от 22 до 40 лет.**
ЗАРПЛАТА ВЫСОКАЯ.
Телефон для справок
**8-029-698-36-93.**
ЧУП "Бовикон" УНН 290363301

---

**АВТОСАЛОН**
**Продаются**

**а/м АУДИ-80 В3,** 90 г. в., 2.0i, 3100$. Тел. **8-029-801-67-59.**

**а/м VW-ГОЛЬФ,** 1.6Д, 86 г. в., белый, 3-дверн., 1000 у.е. Тел. **4-22-82.**

**а/м ФОРД-ТРАНЗИТ,** 2.5Д, 93 г.в. Тел. **8-029-229-69-77.**

**а/м VW-ПАССАТ В3,** 1.8Б, черный металик, моновпрыск. Телефон **8-029-802-26-32.**

---

Ученики 11 "Г" класса ГУО "СОШ №3 г. Иванова" и их родители выражают глубокие соболезнования Федорук Ларисе Евгеньевне и ее семье по поводу постигшего их большого горя - смерти **МАТЕРИ.**

---

**Уважаемая Валентина Михайловна Рудницкая!**

Примите наши искренние соболезнования по случаю постигшего Вас горя - безвременной смерти дорогого Вам человека - **МУЖА.**

***Коллектив ГУО «Мотольский учебно-педагогический комплекс детский сад-СОШ».***

---

Коллектив работников и профком ЧСУП "Ляховичское-Агро" выражают глубокие соболезнования Сахарчуку Василию Алексеевичу по поводу постигшего его горя - смерти **БРАТА.**

---

Коллектив работников и профком ЧСУП "Ляховичское-Агро" скорбят по поводу смерти пенсионерки **ТИПУН Софьи Васильевны** и выражают глубокие соболезнования ее родным и близким.

---

Коллектив стоматологического и зубопротезного отделения выражает глубокое соболезнование Щербук Людмиле Петровне в связи с постигшим ее горем - смертью **МУЖА.**

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Установа "Рэдакцыя газеты "Чырвоная звязда" і праграмы радыёвяшчання "Гаворыць Іванава"
**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:** Іванаўскі раённы выканаўчы камітэт і раённы Савет дэпутатаў
Выходзіць па аўторках і пятніцах, на беларускай і рускай мовах.
Рэгістрацыйны № 812
Індэкс індывідуальнай падпіскі 63951, ведамаснай - 64148.

Адрас рэдакцыі: 225800, г. Іванава, Савецкая, 91
Падпісана да друку ў 9.00.
Заказ №5
Тыраж7000

Галоўны рэдактар Анатоль Мікалаевіч КРЭЙДЗІЧ

Газета набрана на рэдакцыйнай камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэме, аддрукавана афсетным спосабам з арыгінал-макета рэдакцыі ў Пінскай рэгіянальнай друкарні галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама: 225710, г. Пінск, вул. Леніна, 42. Аб'ём - 1 друкаваны аркуш. Фармат 600х420 мм.

ТЭЛЕФОНЫ:

| | |
|---|---|
| галоўнага рэдактара | 2-12-63 |
| адказнага сакратара | 2-20-01 |
| загадчыка аддзела аграрнай палітыкі | 2-15-02 |
| загадчыка аддзела пісьмаў | 2-12-36 |
| аператараў | 2-15-38 |
| бухгалтара | 2-16-46 |
| раённага радыё | 2-14-03 |

Аддзел рэкламы - 2-15-02
АДРАС ЭЛЕКТРОННАЙ ПОШТЫ: zviazda@brest.by САЙТ: WWW.JANOW.BY

Пункт гледжання аўтараў апублікаваных матэрыялаў можа не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў. За дакладнасць рэкламы нясе адказнасць рэкламадаўца.

ISSN 2075-8006